ПАГОНЯ

Адрэс рэдакцыі і канторы: Вуліца Вострабрамская, № 19.

Рэдакцыя адчынена што дзень ад 1—2 гадз.
Кантора адчынена што дзень ад 8—3 гадз.

ГРАМАДЗКАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ І ЛІТЭРАТУРНАЯ ЧАСОПІСЬ.

ВЫХОДЗІЦЬ ЧАСОВА ДВА РАЗЫ Ў ТЫДЗЕНЬ.

Падпіска каштуе:
на 10 № № ўпярод — 10 зал.
„ 5 „ „ — 5 „
Кошт асобнага № — 1 „

Рукапісы не прынятыя да друку назад не вертаюцца; прынятыя аплачываюцца па погляду Рэдакцыі.

Абвесткі ўселякага разьмеру прыймаюцца коштам за радок маленькага друку 2 залатых на апошняй страніцы незалежна ад зьместу.

№ 10. | Вільня, Пятніца, 8 кастрычніка 1920 году. | Год І-шы.

Грамадзяне!

Палякі, пад davодзтвам сваіх памешчыкаў, нападаюць на нашы землі, рабуюць нашы вёскі і месты, праліваюць кроў нашых людзей, яны ўжо дайшлі да Нёману і лезуць ўглуб Літвы.

Не памагла міролюбасьць нашага Ураду, не памагла наша прапанова не ваеваць, не праліваць крыві, а перадаць літўска-польскую спрэчку на разрашенье Лігі Народаў.

Ня мірыўся з намі польскі Урад, ня слухаў ён і Лігі Народаў, ня мірыўся і не мірыцца, бо ў яго адна толькі мэта. заваеваць і зьняволиць нас, цяжкую сваю руку на нас налажыць.

Шырокія нашы полі, ураджайныя нашы загоны і густыя лясы, а ў Польшчы мала добра апрацаванай зямлі, мала лясоў, а многа людзей і не хапае хлеба.

Таму і лезуць яны нас зьняволіць, каб нашу зямельку засяліць палякамі. Лезуць яны нас зьняволіць, растаптаць і, растаптаўшы, мець выхад да шырокага мора і з усім сьветам завязаць гандлёвыя зносіны; лезуць яны нас зьняволіць, каб рэквізаваць у нас коняў, жывелаў, хлеб, бо у іх, з прычыны нескончонае вайны з суседзямі, да того спустошаны край, што ўжо не хапае хлеба дзеля падтрыманьня свайго войска.

Лезуць яны нас зьняволіць, бо іх вядуць нашы памешчыкі, якія добра ведаюць, што калі Літва будзе незалежнай, дык яны пазбавяцца сваіх маёнткаў і маёнтковая зямля будзе раздадзена людзём і тады яны навекі згубяць сваю ўласьць над намі.

Наш Урад робіў, робе і будзе рабіць ўсё, каб навэт і цяпер заключыць мір з палякамі, але мы не павінны дапусьціць палякоў тантаць і рабаваць нашы землі.

Не, мы гэтага не дапусьцім! Мы будзем абараняць нашу зямлю ад польскага захвату і калёнізацыі, бо калі мы яе не абаронім, дык зьбядneем, станем жабракамі і пойдзем у чужыя краі чужым багацьце скапляць і мучыцца ў цяжкой працы.

Абаронім нашых мірных жыхароў ад пагромаў польскіх войск, абаронім нашых жанок ад зьдзекаў.

Абаронім свае вёскі і месты ад рабункаў польскага войска, абаронім свае сьвірны, бо калі не абаронім, дык нас чэкае яшчэ большае горэ, чым у часох рожных акупацыяў.

Абаронімся ад чужацкага войска, што вядзецца нашымі памешчыкамі, бо калі не абаронімся, дык памешчыкі возьмуць над намі верх і тады мы ніколі не будзем мець магчымасьці правясьці зямельную раформу і маёнткі назаўсёды застануцца ў руках памешчыкаў, чы будуць парададзены польскім легіанэрам.

Абаронімся ад іх, бо яны нясуць духоўную няволю ўсяму краю, нясуць духоўную згубу ўсім жывучым ў Літве народам.

Абаронімся ад польскага нападу хто чым можа: ўступленьнем ў шэрэгі стрэльцоў, ахвярай на утрыманьне войска сваей маёмасьці: золата, рожных кляйнотаў, рыхтуючы жаўнераў кашулямі, рукавіцамі, цёплай вопраткай, ссыпаючы ў урадовыя сьвірны зярно і даючы рожныя продукты.

Кожны сумленны дзяцюк, здаровы мужчына павінен сесьці на свайго каня і ехаць на вайну, чы, прытаіўшыся ў кустох і лясох, сьлядзіць за кожным шагам польскага напасьніка і бароцца з ім, бароцца, пакуль ні адзінага ваaружонага паляка не застанецца на нашай зямлі. Наша сумленнае, адважнае войска сваімі грудзьмі, абараняе бацькаўскую зямлю, кладзе свае галовы, але яго сілы, без грамадзянскага падтрыманьня, не хапае, каб адбіць польскія легіёны.

Хто пашкадуе свaей маёмасьці на утрыманьне свайго войску, хто як нявольнік, ад хіліцца ўхапіцца за аружжа, дык нехай памятае, што прыйшоўшыя палякі адбяруць гэту маёмасьць, што яны нас растопчуць, унізюць, што нашых мужчын мабілізуюць і улюць ў сваё войска.

Калі не пралiём сваей крыві, абараняючы свой край і сваю свабоду, дык пралiём яе за інтэрэсы палякоў і нашых памешчыкаў.

Сёньня мы павінны стаць навекі свабодными, незалежнымі, павінны сваё дабро абараніць, чы навек застацца нявольнікамі чужынцаў і ім дабро накапляць.

Нехай жыве незалежная і самым народам упраўляемая Літва!

Устаноўчы Сойм.

Коўна,
1920—IX—25 дн,

◆◆◆◆◆◆

Вільня, 8—X 1920 г.

Да вайны адзіным палітычным цэнтрам ўсей Беларусі было места Вільня. У гэтым часе гэты цэнтр перанёсься ў Менск, дзе, як бачым, ўсе вядомыя беларускія дзеячы з галоснымі сярод беларусоў назовамі згуртаваліся каля беларускага выдавецтва, як напрыклад: Янка Купала, Змітрок Бядуля, Галубок, Цішка Гартны, Алехновіч і інш.

Другія беларускія дзеячы згуртаваліся ў Рызе, Бэрліне, і Празе-Чэшска. У Вільні цяперка знайходзіцца вельмі невялічкая кучка „палітычных дзеячоў“, удачна захаваўшаяся пры ўсіх акупацыях, якая, пад назовай „Беларускага Нацыянальнага Камітэту“, прэтэндуе на роль сувэрэннага беларусскага органу, што відаць з памешчэнага у газэце „Виленское Слово“ № 9 справазданьня з паседжэньня 18—IX. Гэта кучка зусім ня лічыцца ні з дэмакратычнымі выбарамі, ні з інтэрэсамі народу, ні з этнаграфічнымі і географічнымі варункамі беларускай народнасьці, ні з палітычнымі абставінамі, дужа лоўка прыкрываваючыся нацыянальным лозунгам, істнуе ўжо некалькі гадоў.

Ўся работа гэтай кучкі завераецца ў тым, каб даказаць, што яна істнуе і нешта камусь-та на карысьць робе. А гэта работа як раз відаць з пісьма у рэдакцыю, зьмешчанага у Віленскім Слове № 15.

З прыходам у Вільню розных акупантаў, гэтая кучка людзей выносе зараз-жэ да палітычнага мамэнту прыстасаваныя рэзалюцыі, даючыя ім быццам магчымасьць адступіць ад ранейшых сваіх ідэалоў і прыступіць да супольнай працы з акупантамі. Гэтак было пры немцах, гэтак было пры бальшэвіках, гэтак было пры паляках. Гэтыя рэзалюцыі усім ведамы; яны пасыладіся ў Обер-Ост, вазіліся ў Варшаву, гаварыліся бальшэвікам. Народ беларускі часам пасылаў гэтым дзеячам, езьдзіўшым ў Варшаву, тэлеграмы такога зьместу: „Закройце вашэ акцыянэрнае Таварыства па запрадажэ Беларусі палякам“, але голас гэты аставаўся голасом клічучага ў пушчы, а акупанты часам глядзелі на гэтую кучку, як на сваіх прыяцелеў і часам капалі грашмі.

Цяпер гэтая кучка „дзеячоў“ таксама хочэ прыстасавацца да новых варункоў. Як бачым з лісту у рэдакцыю газэты „Виленское Слово“ № 15, ўжо гэтая кучка людзей пасьпяшыла аж на 2 тыдні раней прыходу Літоўскай Улады у Вільню вынясьці няведамую нікому рэзалюцыю, быццам, „лояльную“ к літоўцам, лічучы гэтым хыба здабыць сабе даверэньне або ласку, пэўне за сваю антылітоўскую працу ў часох акупацыяў, а мо быць таксама дастаць і грошы.

Калі мы возьмем быццам „лояльную“ рэзалюцыю так званага „Беларускага Нацыянальнага Камітэту“, непрызнанага ні самім беларускім грамадзянствам, ні Міністрам Беларускіх Спраў, і сапаставім з сусім нелояльнымі вымаганьнямі беларускай дэлегацыі, прыеждажўшай ў Коўну не ад імені „Нацыянальнага Камітэту“ выражаць яго „лояльнасьць“, як гэта гаворыцца між іншымі непраўдамі ў „пісьме ў рэдакцыю“, а ад імені „ўсіх беларускіх арганізацыяў“, дык мы ўбачым, што ўсе яны—і Дэлегацыя і Камітэт—гавораць ад імені грамадзян, ды толькі адны гавораць „лояльна“, а другіе — „нелояльна“. Каму цяпер верыць? Пэўней было-б верыць ў шчырасьць „нелояльных“ вымаганьняў дэлегацыі, але справа ў тым, што ў Літоўскай Рэспубліцэ сам народ гаворэ за сябе і сам сабой упраўляе і не патрабуе ні розных самазваных „прэдставіцелеў“, ні самародных арганізацыяў, надаючых сабе правы гаварыць ад імені народу і самавольна лічучых сябе „едзінственными правомочными прэдставітельствамі беларускаго населенія Літвы“. Толькі выбары у Сойм надаюць правы выбраным выступаць і гаварыць ад імені сваіх выбаршчыкоў.

Усякага роду акупанты мейсцовых варункоў ня ведалі і вас, паны з „Камітэту“, добра не зналі, а літоўцы прышлі сюды як гаспадары сваей хаты і вельмі добра ведаюць, хто і што ў хаце яго рабіў і робіць!

◆◆◆◆◆◆

Беларускія стрэльцы

У Вільні пачалася арганізацыя беларускага атраду Сувязі Літоўскіх Стрэльцоў. Усе, каму дарага Літва, кожны, хто хоча залажыць белы камень пад фундамант дзяржаўнага літоўскага будаўніцтва, нехай зарэгіструецца ў ПРАЎЛЕНЬНІ Атраду—Вострабрамская, 19 (гдзе Міністэрства Беларускіх Спраў).

◆◆◆◆◆◆

Спаўняючы абавязкі Прэзыдэнта Рэспублікі Старшыня Устаноўчага Сойму апавешчае гэты закон, прыняты Устаноўчым Соймам 26 ліпеня 1920 г.

Закон аб надзеле ваенных зямлёй.

§ 1. Ваенныя беззямельныя і малазямельныя грамадзяне Літвы, якія самаахвотна ці па прызыву Літоўскага Ураду паступілі ў Літоўскую Армію абараняць незалежнасьць Літвы і, абараняючы яе, ня былі пад судом і шчыра праслужылі да канца вайны і дэмабілізацыі, маюць перавагу перад другімі ў атрыманьні зямлі ад Гаспадарства.

Увага 1. Не надзяляюцца зямлёй воіны, якія караны судом за крымінальныя праступкі чы за здраду бацькоўшчыны і якія дзеля гэтага агранічаны ў правох па карацельнаму статуту §§ 29 і 30, таксама не надзеляюцца зямлёй ваенныя, ня умеючыя абрабатываць зямлю і маючыя іншыя історчнікі срэдстваў жыцьця.

Увага 2. Ваенныя, якія шчыра ў войску служылі і, дзеля раненьня чы страты здароўя, зусім зволненыя ад ваеннай службы, а раўна і шчыра праслужыўшых і забітых як і памёршых воінаў семьі, а так-сама ваенныя, праслужыўшыя абазначаны час, хаця яшчэ ня зволненыя з войску, надзеляюцца зямлёй раней ад другіх ваенных.

§ 2. Правы ваенных, паказаныя ў § 1 гэтага закону, ў выпадку іх сьмерці на полі бітвы чы ў іншым мейсцу пры спаўненьні службовых абавязкаў, пераходзяць на дзяцей і жонку, а калі іх німа—да бацькоў.

§ 3. Малазямельнымі лічуцца тыя, хто сам чы яго бацька маюць на правох уласнасьці ня больш 6—10 дзесяцін зямлі, годнай для абрáботкі, лічучы кожнаму сыну, але ўсё каб тварыла ня больш 20 дзесяцін зямлі.

§ 4. Для гэтае мэты зямля бярэцца:

а) з находзячыхся ў распараджэньні Гаспадарства ўсіх родаў зямель,

б) з прымусова ўзятых ад прыватных уласьнікаў, маючых ад 300 да 800 дзесяцін да 15%, а ад маючых больш 800 дзесяцін да 30%.

Увага. Зямля ад прыватных уласьнікаў бярэцца жывым і мёртвым інвэнтаром, насенамі і іншай маемасьцю лічбай, адпавядаючай колькасьці забіраемай зямлі.

§ 5. Калі выконваючы §§ 4 і 9 закону аб надзеле ваенных зямлёй, сустрэкаюцца сумежныя вёскі чы наагул ўтаргаючыяся палосы і калі іх ўласьнікам не ўдаецца ўсё ўладзіць мірным чынам, то гэтыя землі могуць быць забіраемы прымусам. У гэтых выпадках, замест забраных зямельных вучасткаў дзеля парцэляцыі, ўласьнікам іх аддаецца вучастак зямлі тэй самай вартасьці ў адпаведным мейсцы.

§ 6. Для прымусовага выдзелу зямлі складаецца ў кожным павеце камісыя з Міравога Судзьдзі, члена паветавага самаўраду, прэдстаўніка Міністэрства Земляробства і Дзяржаўнай Маентнасьці, пры старшынёўстве Міравога Судзьдзі.

§ 7. Як Гаспадарства разлічыцца з ўласьнікамі і на якіх варунках, надзялёныя зямлёй па гэтаму закону ваенныя людзі зробяцца ўласьнікамі — аб гэтым пастановіць Устаноўчы Сойм.

§ 8. Зямля, адходзячая для патрэб ваенных людзей, аддзеляецца кожны раз на падставе глаўнай камісыі аб надзеле ваенных зямлёй, якая складаецца з Міністраў: Земляробства і Дзяржаўнай Маентнасьці, Унутраных Спраў, Абароны і Справядлівасьці, пры старшынёўстве Міністра Справядлівасьці. Пастановы глаўнай Камісыі аканчацельны.

§ 9. Кожнаму ваеннаму зямля даецца з умовай, каб яго ўласнасьць заверала ўсяго з

а) 1-га разраду ад 8—12 дзесяцін
б) 2-га „ „ 12—16 „
в) 3-га „ „ 16—20 „

§ 10. Кожнай такой пачынаючай гаспадарцы з срэдстваў Дзяржавы даецца адначасовая дапамога да 100 пнёў стаячага лесу, ад 6—8 цаляў таўшчыны, і насёна на засеў да 30 пудоў азімага і 50 пудоў яравога.

§ 11. Пасьля надзелу маёнтковых ваенных зямлей, могуць атрымаць зямлю і маёнтковыя беззямельныя і малазямельныя, ў першы чарод тыя малазямельныя, палі якіх сумежны з зямлёй аддзеляемага маёнтку і тыя таго-ж маёнтку работнікі, якія жанаты і маюць дзяцей і раней жылі ў тым маёнтку. Такія малазямельныя і беззямельныя могуць атрымаць да 20 дзесяцін зямлі на §§ 7, 12 і 13 так, каб разам з іх ўласнасьцю складалася ня больш 20 дзесяцін.

Увага. § 10 не датычэ не ваенных, малазямельных і беззямельных.

§ 12. Надзялёная зямля ня можа быць перадана чы іншым чынам пераўступлена бэз згоды Ураду. У такіх выпадках Урад мае права ўзяць назад зямлю, уплаціўшы выдаткі па будоўле жыльля і па удабрэньню зямлі.

§ 13. Здаваць у арэнду дазваляецца толькі са згоды Ураду ў гэтых выпадках:

а) ў выпадку сьмерці главы семьі чы яго доўгай хваробы, калі яго дзеці яшчэ малыя,

б) ў выпадку прызыву главы сямьі, чы шляхам выбараў спаўняючага грамадзянскія чы дзяржаўныя абавязкі, дзеля якіх ён ня можэ сам вясьці гаспадаркі.

Увага. Надзялёны зямлей на першым, чы на другім гаду, з дазваленьня Паветавай Зямельна-Гаспадарчай Камісыі, можа атрымаваную зямлю здаць ў арэнду.

А. Стульгінскі,
спаўняючы абавязкі Прэзыдента Рэспублікі, Старшыня Устаноўчага Сойму.

Д-р Грынюс,
Старшыня Міністраў.

Коўна,
3 жніўня, 1920 г.

◆◆◆◆◆◆

з Вескі.

Вёска Вусьця, дзе стаіць наша беларуская вайсковая частка, выказавае радасьць, што бачыць на сваей зямлі вайсковых братоў-беларусаў і вельмі дзякуе Міністру Беларускіх Спраў і камандзеру гэнай часткі Маёру Ружанцаву за дбаньне аб лёсе селян, за абарону іх межаў ад чужынцаў і за насланьне літэратуры ў роднай беларускай мове.

◆◆◆◆◆◆

Весткі з Менску.

З пачатку верасьня сядзяць у турме Старшыня Менскага Камітэту Беларускай партыі Соцыялістаў-Рэвалюцыянэраў Берднік.

Сядзяць у турме ад часу прыхода савецкай улады афіцэры Беларускай Вайсковай Камісыі,—Семенякa і Палешук.

У Менску, пад назовай Беларускага Рабочага Клюбу, адчынена арганізацыя менскай беднаты, для каторай, каб паказаць ласку савецкай улады, адчынена сталоўка, робіцца вечарынкі і чытаюцца бальшавіцкія агіт. лекцыі.

Выдавецтва Камісарыяту Асьветы нібы то згодна выдаць колькі кніжак для школ і літэратурных беларускіх зборнікаў, але кажа, што пакуль што німа паперы...

Па Менску і губэрніі, згодна пратаколаў селян, адчынена да 100 беларускіх школ. Бусылаўская гімназыя, зачыненая і зруйнованая палякамі, зноў пачынае сваю чыннасьць.

◆◆◆◆◆◆

палітычны агляд.

Цікавасьць палітычнага дня ва ўсіх гаспадарствах Старога і Новага Сьвету сканцэнтравана ў Рызе: там чакаюць часткавага разрашэньня так званага расейскага пытаньня.

Узапраўды, каб расейска-польскія перагаворы прыйшлі да канешнага разрашэньня, дык большая часьціна ЎсходняйЭўропы збавілася-б ад вужасаў многагадовай вайны і народы былшага Расейскага Гаспадарства маглі-б спакойна заняцца сваімі унутранымі справамі.

Але нішто не прэдрэкае гэтага. Наадварот, з пэўнасьцю можна сказаць, што мір паміж Польшчай і Савецкай Расеяй заварт ня будзе. У гэтым астатнім упэўняе і тон польскага друку усіх палітычных адценяў, і тыя дамаганьні, якія, па некаторым весткам, польская дэлегацыя збірaецца прэд'явіць рускім, а іменна: разаружэньне савецкай арміі і прызнаньне пратэктарату Польшчы над малымі „каталіцкамі" гаспадарствамі — Літвой, Беларусіей і Украінай.

Ў замежным друку даволі выразна вымалевана роль Францыі ў пытаньні аб чакаемым міру. Францыя прыгатаўляецца ўсімі спосабамі да нанесеньня новага удару расейскаму бальшавізму. Яна энэргічна дапамагае гэнэралу Врангелю і Польшчы ў іх барацьбе з Саветамі, яна сама гатова з аружжам ў руках выступіць проціў іх і шукае толькі спасобнасьці для выкананьня свайго пляну.

Адным словам, ў Рызе прайсходзіць кукальная камэдыя для атводу вачэй тых польскіх работнікаў, якія хочуць міру ў чым бы не стала і якіх расейскія саветы хацелі вааружыць на польскі кошт проціў іх ураду для міравой вайны, якое дамаганьне і было прэд'яўлена Польшчы яшчо ў Менску.

Польшча шчыра міру ня хоча, дзеля таго, што яна знае, што яе дамаганьні ніколі ня будуць пацьверджаны мірным трактатам. Пачкі таксама бэзнадзейна абстаіць палажэньне з пытаньнем аб улажэньні польска-літоўскага канфлікту. Польскі друк аглашае, што Кальварыйская канфэрэнцыя сарвана літоўцамі пасьля таго, як палякі добра высьнілі, што Літва зацягівае час дзеля сканцэнтраваньня як-бы на яе тэрыторыі ў тылу вялікай расейскай арміі, якая павінна нанясьці астатні удар палякам. Між тым, ўсякаму ведама, што Літва, трымаючы строгі нэйтралітэт, павінна, як гаспадарства суверэннае, бараніць яго і змагацца з яго нарушыцелямі, што і выпаўняе, пасколькі хватае сіл і магчымасьці; польскія-ж варункі устанаўленьня дэмаркацыйнай лініі ўнутры Літоўскай тэрыторыі ніяк ня могуць быць ёю прыняты, бо нарушаюць нэйтралітэт.

На першым пасяджэньні Лігі Народаў прэдстаўнікі абодвых народаў прэдставілі так працаўрачучыя паказаньні, што ня можна чакаць у блізкайшай будучыне разрашэньня гэтага канфлікту.

Д. З.

◆◆◆◆◆◆

АБВЕШЧЭНЬНЕ

Міністэрства Грашовых Спраў, Гандлю і Прамысловасьці абвешчае для агульнага ведама, што на межах Зволненых мейсцовасцей Літвы адчынены тамажні: у Ялоўцы, Ежэрэнах (Нова-Александраўск) і Турмонтах, адчыняюцца: у Браславе, Паставах. Апрача таго адчынена тамажня у Вільні на жалезна-дарожнай станцыі—транзытная складачная тамажня згодна пастанове Габінэту Міністраў ад 2-го жніўня 1920 году ўсе тавары, увезенныя з замежных гаспадарстваў у зволненыя ад польскай акупацыі часткі Літвы павінны быць аплачаны тамажэнным, а іншыя і акцызным зборам на агульных падставах, калі яны не аплочаны Літоўскаму Ураду (Гаспадарству). Час аплаты устанаўляецца з дню апублікаваньня гэтага абвешчэньня да 1-го лістападу гэтага году. Аплаціць тавары вышэй памяненым зборам можна у бліжэйшых тамажнях, у Вільні-ж у Тамажэнным Дэпартаменце (Мастовая вул. д. № 4), у якія гаспадары тавараў павінны падаць заявы разам са спісам тавараў, у заяве павінен быць паказан лік і вартасьць тавараў. Заплаціўшыя пошліну атрымліваюць квітанцыю, тавары, як: скура, скурныя вырабы, абуцьцё, мануфактура усякага роду, мануфактурныя вырабы, стужкі, вязаныя вырабы, зэгаркі, карты да гуляньня, парасолі, іголкі, парламутровыя гузікі, шапкі, капялюшы, сьпіртовыя напоі, віна, табачныя вырабы — будуць абзначаны тамажэнным клеймом, што гэтыя тавары аплачэны пошлінай. Вышэй памянёные тавары бэз тамажэнных знакаў, а роўна неаплачэныя да 1-го лістападу гэтага году пошлінай, — будуць лічыцца кантрабандай. Уласьнікі кантрабандных тавараў будуць прыцягнуты да адпавездальнасьці судзебным парадкам і караемы згодна § 56 часовага пастанаўленьня Літоўскага Таможэннаго Уставу да 6 месяцаў арэшту і штрафам да 5000 літоўскіх марак. Тавары будуць канфіскованы. Кожны грамадзянін мае права затрымаць кантрабанду і даставіць яе ў таможню. Затрымаўшым і даставіўшым кантрабанду тамажня выплачвае частку суммы атрыманай ад прадажы кантрабанды. Замежныя тавары, якія згодна Літоўскіх законаў забаронены да ўвозу ў Літву, — Тамажэнны Дэпартамэнт будзе дазваляць вывазіць з зволненых ад польскай акупацыі частак да 1-го лістападу гэтага году, пасьля сканчэньня гэтага тэрміну, гэтыя тавары будуць канфіскованы.

За Міністра Грашовых Спраў, Гандлю і Прамысловасьці Добкевіч.

Час. сп. аб. Дырэктара Таможэннага Дэпартамэнту В. Даміонайціс.

Вільня, 27 верасьня 1920 г.

Абвестка.

МІНІСТЭРСТВА БЕЛАРУСКІХ СПРАЎ

з панядзелку 27 верасьня 1920 году пераехала з Коўна ў места Вільню і памешчаецца на Вострабрамскай вуліцы, ў доме № 19.

Выдавецтва і рэдакцыя: Стол Друку Міністэрства Беларускіх Спраў. Вільня, Вострабрамская, 19.
ДРУКАРНЯ А. БАКА і Х. МАНКЕСЪ ВІЛЬНЯ, рог Даменіканскай і Унівэрсытэцкай.